Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Факультэт музычнага мастацтва
Кафедра народна-песеннай творчасці

САГЛАСАВАНА
Загадчык кафедры
________________________
___ ____________20___ г.

САГЛАСАВАНА
Дэкан факультэта
________________________
___ ____________20___ г.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# ВЫКАНАЛЬНІЦКАЕ МАЙСТЭРСТВА

па спецыяльнасці
1-16 01 10 Спевы (па напрамках)
напрамку спецыяльнасці
1-16 01 10-02 Спевы (народныя)

Складальнік
Грамовіч І.М.

Разгледжана і зацверджана
на пасяджэнні Савета ўніверсітэта 21.05.2019
пратакол № 9

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Складальнік:
Грамовіч І.М., кандыдат педагагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры народна-песеннай творчасці ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў

Рэцэнзенты:

Смагін А.І. доктар мастацтвазнаўства, прафесар, прафесар кафедры культуралогіі ПУА “Інстытут сучасных ведаў імя А.М. Шырокава”

Дожына Н.І., загадчык кафедры тэорыі музыкі і музычнай адукацыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

Разгледжаны і рэкамендаваны да зацвярджэння:

кафедрай беларускай народна-песеннай творчасці (пратакол ад 24.03.2019 № 7)
Саветам факультэта музычнага мастацтва (пратакол ад 29.04.2019 № 9)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ

1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА………………………………........ 4
2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ…………………………………………… 6
2.1 Змест аўдыторнай работы студентаў па матэрыялу вучэбнай дысцыпліны «Выканальніцкае майстэрства»: тэарэтычная частка 6

3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ…………………………………………… 21
3.1 Змест работы студэнтаў па матэрыялу вучэбнай дысцыпліны «Выканальніцкае майстэрства»: практычная частка……………… 21
3.2 Метадычныя рэкамендацыі выкладчыкам……………………... 29
3.3 Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі самастойнай работы студентаў…………………………………………………………… 32
3.4 Рэпертуарны спіс…………………………………………………. 34

4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ…………………………………....... 36
4.1 Заданні для самастойнай контралюемай работы студэнтаў….. 36
4.2 Рэпертуарныя праграмныя патрабаванні па засваенню тэм вучэбнай дысцыпліны……………………………………………………………. 39
4.3 Сродкі дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці…………………………………………………………... 40

5. ДАДАТКОВЫ РАЗДЗЕЛ………………………………........... 41
5.1 Вучэбная праграма ……………………………………………............ 41
5.2 Асноўная літаратура………………………………………………….. 51
5.3 Дадатковая літаратура……………………………………………….. 52

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне «Выканальніцкае майстэрства» неабходны для вучэбна-метадычнага забеспячэння працэса падрыхтоўкі студэнтаў па спецыяльнасці «Спевы” (па напрамках), напрамку спецыяльнасці “Спевы (народныя)” у адпаведнасці з патрабаваннямі Палажэння аб вучэбна-метадычным комплексе на узроўні вышэйшай адукацыі, зацверджаным Пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 26.07.2011 №167.

Мэтай выдання з’яўляецца фарміраванне ў студэнтаў комплекснай сістэмы ведаў, навыкаў, уменняў і кампетэнцый у вобласці выканальніцкай дзейнасці, прадугледжанай вучэбным планам установы вышэйшай адукацыі па напрамку спецыяльнасці і патрабаванням адукацыйнага стандарта Рэспублікі Беларусь ОСВО 1-18 01 01 2013 Народная творчасць.

Асноўнымі задачамі ВМК з’яўляюцца:

– забеспячэнне павышэння якасці атрымання адукацыі па спецыяльнасці Спевы (па напрамках), напрамку спецыяльнасці Спевы (народныя);

– вызначэнне дыдактычных сродкаў навучання, арыентаваных на найбольш поўную рэалізацыю адукацыйных задач, сфармуляваных у вучэбнай праграме УВА па дысцыпліне “Выканальніцкае майстэрства”;

– пашырэнне агульных і прафесійных ведаў студэнтаў;

–ажыццяўленне вучэбна-метадычным суправаджэннем паслядоўнага засваення студэнтамі тэарэтычных ведаў і практыкі выканальніцкага майстэрства;

- аказанне дапамогі выкладчыкам і студэнтам УВА у набыцці і засваенні перадавых ведаў як тэарэтычнага так і практычнага характару у вобласці народна-песеннага выканальніцтва.

Раздзелы, уключаныя ў ВМК, неабходныя для аптымальнага суправаджэння адукацыйнага працэса і фарміравання ў студэнтаў кампетэнцый для вырашэння прафесійных задач.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Структурнымі элементамі вучэбна-метадычнага забеспячэння, якія прадстаўлены ў ВМК, з’яўляюцца вучебна-праграмныя, вучебна-метадычныя і інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы.

У тэарэтычным раздзеле ВМК адлюстраваны змест аўдыторнай работы па вучэбнай дысцыпліне “Выканальніцкае майстэрства”, а таксама тэарэтычны матэрыял, адпаведна патрабаванням вучэбнай праграмы.

Практычны раздзел асвятляе практычную частку работы студентаў па матэрыялу вучэбнай дысцыпліны (пытанні для калектыўнага разгляду, заданні для самастойнай работы з дадаткам навукова-тэхнічных, вучэбна-метадычных і нотных крыніц для самападрыхтоўкі студэнтаў), метадычныя парады выкладчыкам, метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі кіруемай самастойнай работы, а таксама прыкладны рэпертуарны спіс.

Раздзел контроля ведаў прадстаўлены матэрыяламі для маніторынгу вынікаў дзейнасці студэнтаў і уключае ў сябе заданні для КСРС, рэпертуарныя праграмныя патрабаванні па засваенню тэм вучэбнай дысцыпліны, спіс рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці.

Дадатковы раздзел уключае вучэбную праграму па вучэбнай дысцыпліне “Выканальніцкае майстэрства” і спіс літаратуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 2.1. Змест аўдыторнай работы па вучэбнай дысцыпліне «Выканальніцкае майстэрства»: тэарэтычная частка

Дысцыпліна "Выканальніцкае майстэрства" з'яўляецца адной з асноўных дысцыплін у падрыхтоўцы будучых выканаўцаў народнай песні, творчай лабараторыяй, дзе выхоўваюцца прафесійныя навыкі і ўменні выканаўцаў народнай песні.

Заняткі па выканальніцкім майстэрстве праводзяцца ў цесным узаемадзеянні з іншымі дысцыплінамі. Перш за ўсё гэта сольныя спевы, харавы клас, асновы танцавальных рухаў, бытавы народны танец, беларускі народны інструмент. акцерскае майстэрства і інш.

Мэта ВМК- даць будучаму спецыялісту неабходныя веды ў галіне вакальнай, танцавальнай і музычнай культуры Беларусі, вытокаў і формаў бытавання народнай манеры спеваў.

Асноўныя задачы дысцыпліны:

-асваенне навыкаў і прыёмаў народна-песеннага выканання;

-авалоданне навыкамі спеваў у складзе фальклорнага гурту;

-выхаванне пластычнай культуры танцавальных рухаў;

-асваенне асноўных прыёмаў малюнка танца ў спалучэнні з тэкстам музычна-песеннага матэрыялу.

Тэарэтычны і практычны матэрыял, які закладзены ў ВМК, дапамагаюць студэнту засвоіць:

-традыцыйную вакальна-харавую, танцавальную і музычную культуру Беларусі;

- асноўныя накірункі выканальніцкага майстэрства;

- асновы народнай харэаграфіі ў вакальна-харэаграфічных кампазіцыях;

- практычныя навыкі рэжысуры канцэртнага нумара.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 1. Асаблівасці тэхналогіі народнай манеры спеваў

Народная манера – гэта комплекс вакальна-выканальніцкіх сродкаў і прыёмаў, што склаліся на аснове рэгіянальных гісторыка-культурных і мастацкіх традыцый пад уздзеяннем бытавога песеннага асяроддзя. Яна заснавана на асаблівасцях дыялекту, музычнай мовы і выканальніцкага стылю шэрага пакаленняў народных спевакоў пэўнай мясцовасці.

Народная манера спеваў абумоўлена наступнымі асаблівасцямі гучання: натуральны, "блізкі" гук, свабодная артыкуляцыя, блізкая да гутарковага вымаўлення, наяўнасць груднога рэзаніравання. Народны голас характарызуецца гучнай, яскравай, мяккай, светлай афарбоўкай гучання. Увесь гук быццам сабраны блізка ў поласці рта, "на вуснах". Умелыя народныя выканаўцы ніколі не спяваюць рэзкім, крыклівым або глыбокім гукам (выключаючы спевы на адкрытым паветры).

Увесь працэс спеваў немагчымы без кантролю адчуванняў – слыхавых і мускульных, якія выконваюць вельмі важную ролю ў развіцці галасавых навыкаў і ўменняў. Неабходна вучыцца слухаць і кантраляваць сябе ў час спеваў, а таксама аналізаваць асабістыя адчуванні і выпраўляць памылкі свайго голасаўтварэння.

Практыка работы са студэнтамі на занятках па выканальніцкім майстэрстве паказвае, што досыць яснае ўяўленне аб механізме голасаўтварэння дазваляе ім лепш зразумець, асэнсаваць і засвоіць свае адчуванні падчас спеваў і хутчэй выпрацаваць правільныя вакальныя навыкі.

Голас узнікае ў выніку вібрацыі галасавых складак, якія супрацьстаяць напору выдыху. У песенным гукаўтварэнні прымаюць удзел шматлікія групы мышцаў: дыхальныя, артыкуляцыйныя, гартанныя і інш. У працэсе авалодання спевамі работа мышцаў перабудоўваецца, удакладняецца, выпрацоўваецца ў патрэбным напрамку пад уздзеяннем навучання. Утвараюцца неабходныя сувязі, рэфлексы. Непатрэбныя рухі і напружанасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

знікаюць, фарміруюцца трывалыя вакальныя навыкі, у выніку якіх голас павінен гучаць энергічна, чыста, свабодна. “Блізкае” ці “далёкае” гучанне голасу залежыць ад арганізаванасці гучання, ад найлепшага акустычнага эфекту, які ствараецца пры дапамозе артыкуляцыі спевака.

## Тэма 2. Песенная ўстаноўка

Гукаўтварэнне з'яўляецца тым фізіялагічным працэсам, якому падпарадкоўваюцца ўсе дзеянні голасаўтваральнай сістэмы. Спявак павінен ведаць гэтыя заканамернасці і на асабістым вопыце адчуць спеўны працэс. Галоўныя ўмовы спеваў – гэта ўнутраная поўная фізічная свабода выканаўцы. Яна дасягаецца натуральнай позай спевака: роўны і свабодны корпус, распраўленыя плечы, роўнае становішча галавы, роўныя калені, ногі з апорай на пяткі, спакойна апушчаныя ўздоўж тулава рукі. Мышцы твару спакойныя, без напружання. Ідэальным становішчам спевака лічыцца становішча стоячы. Неабходна дабівацца таго, каб у час спеваў спявак не закідваў галаву, не грымасклічаў. Яго дзеянні павінны быць натуральнымі і арганічнымі, як у працэсе размовы.

У самым пачатку навучання спявак пры дапамозе выкладчыка павінен замацаваць у свядомасці таксама і нярвова-мышачныя адчуванні: найбольш натуральнае і зручнае становішча ротаглотачнай поласці і ўсяго галасавога апарату пры падрыхтоўцы да спеваў.

Песенная ўстаноўка ўтвараецца пры імкненні да позеху. У гэтым становішчы мяккае паднябенне падымаецца, адкрываючы шлях у галаўны рэзанатар да высокай пазіцыі гуку, гэта надае голасу бляск і палётнасць. Корань языка прыціскаецца ўніз, павялічваючы прастору ротаглотачнага рупару. Гартань пры гэтым аўтаматычна апускаецца. Язык падаецца ўперад, упіраючыся ў ніжнія зубы, ніжняя сківіца (разам з языком) высоўваецца ўперад і апускаецца ўніз, адкрываючы рот. Дыяфрагма апускаецца, расцягваючы сценкі жывата. Пры гэтым узнікае адчуванне ціску (апоры) на жывот, які прыметна выпінаецца ўперад.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, песенная ўстаноўка дае зыходны імпульс правільнаму гукаўтварэнню і павінна быць замацавана да аўтаматызму ў працэсе спеваў.

## Тэма 3. Дыкцыя і работа артыкуляцыйнага апарату

Для захавання стабільнага становішча гартані неабходна правільная работа артыкуляцыйнага апарату. Калі мы вымаўляем галосныя і зычныя гукі, гартань змяшчаецца ўверх ці ўніз. Гэта лёгка адчуць наводмацак. Неабходна пакласці далонь на кадык і адчуць яго рухі. У працэсе спеваў пастаянная змена галосных і зычных увесь час выбівае гартань са спакойнага песеннага становішча, такім чынам парушаючы вакальныя якасці спеўнага голасу.

Дзякуючы правільнай песеннай артыкуляцыі, мы дасягаем не толькі чысціні вымаўлення галосных, але і іх прыгожай песеннай афарбоўкі, ці, інакш кажучы, "правільнага рэзаніравання" голасу.

Вакальная дыкцыя ўключае два элементы: творчы і тэхнічны. Творчым элементам з'яўляецца мастацкая размеркаванасць зместу слова ў залежнасці ад ідэі, сюжэта і сэнсу выконваемай песні. Тэхнічным элементам дыкцыі з'яўляецца ўменне чыста, поўнакаштоўна спяваць галосныя і дакладна вымаўляць зычныя. Усе галосныя павінны гучаць ясна. Зычныя тым часам не павінны перашкаджаць гэтаму патоку галосных. Выпрацоўка правільнай песеннай артыкуляцыі дае магчымасць плаўна пераводзіць адзін галосны ў другі, не выбіваючы гартань са спакойнага і ўстойлівага становішча.

У спевах, таксама як і ў мове, артыкуляцыя ажыццяўляецца мышцамі языка. мяккага паднябення, глоткі, ніжняй сківіцы і вуснаў. Гэтыя органы знаходзяцца ў актыўным стане і пастаяннай гатоўнасці да перабудовы. Данясенне да слухача паэтычнага тэксту песні – вынік добрай дыкцыі, дакладнага вымаўлення галосных і зычных. Дыкцыя таксама з'яўляецца адным з важных сродкаў мастацкай выразнасці і раскрыцця музычнага вобраза. Прычынай дрэннай дыкцыі з'яўляецца млявая праца артыкуляцыйнага апарату. Гэты недахоп адлюстроўваецца на якасці гуку, які

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

становіцца невыразным. Прычына: маларухомасць языка, вуснаў, напружанасць ніжняй скіўіцы, недастаткова раскрыты рот пры спевах, напружанасць мышцаў шыі і галавы.

Добрая дыкцыя - гэта аснова спеваў. Правілы арфаэпіі ў спевах прытрымліваюцца пэўных патрабаванняў:

– нейтралізацыя галосных ў спевах;

– вытрымліваць гук на галосным больш ці менш працягла;

–вымаўляць галосны ў розных рэгістрах;

– хутка вымаўляць зычныя;

– зычныя, якія заканчваюць склад, адносіць да пачатку наступнага слова.

## Тэма 4. Песеннае дыханне

Выканальніцкае майстэрства спевака залежыць ад такога важнага фактара, як магчымасць карыстацца песенным дыханнем.

Песеннае дыханне адрозніваецца ад штодзённага дыхання, якое заснавана на рытмічным раўнамерным удыху і выдыху. У спевах удых хуткі, а выдых працяглы. Існуе некалькі тыпаў дыхання: ключычнае (удзельнічаюць толькі плечы), груднoе (удзельнічаюць мышцы верхняй часткі грудной клеткі), ніжнярэбернае (пашыраюцца ніжнія рэбры), дыяфрагмальнае (апускаецца дыяфрагма). Найбольш мэтазгодны тып дыхання для спеваў – грудабрушны, ці дыяфрагмальны. Тут актыўна працуюць мышцы як грудной, так і брушной паласцей, а таксама дыяфрагмы, што дазваляе набіраць дастатковы для спеву аб'ем паветра.

У чым заключаецца тэхніка дыяфрагмальнага дыхання? Удых ажыццяўляецца шляхам апускання дыяфрагмы, грудабрушной мышачнай перагародкі, якая аддзяляе грудную поласць ад брушной.

Каб удых быў досыць глыбокім і поўным, яго трэба браць у ніжні аддзел грудной клеткі. Пры гэтым энергічна падымаюцца і пашыраюцца ніжнія рэбры, што магчыма адчуць далонямі, калі пакласці іх на спіну, на рэбры. Такі рух значна павялічвае аб'ём грудной клеткі і таму забяспечвае



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

патрэбны запас дыхання. Акрамя таго, пашыраныя ніжнія рэбры расцягваюць прымацаваную да іх дыяфрагму і тым самым ствараюць найлепшыя ўмовы для яе работы.

Для таго, каб адчуць правільнасць удыху, трэба стаць роўна. Адначасова з нахілам тулава наперад зрабіць удых. Вы павінны адчуць, як у верхняй частцы жывата, рассоўваючы ніжнія рэбры, паветра быццам занянімае сваё месца. На паўзе паміж удыхам і выдыхам дыханне затрымліваецца і далей робіцца плаўны павольны выдых.

Пры спевах патрэбен дастатковы аб'ём паветра. Дыханне павінна быць актыўным, "на апоры" і мэтанакіраваным. Арганізацыя правільнага дыхання дапамагае вызваліцца ад шматлікіх недахопаў у голасаўтварэнні.

Пры рабоце над дыханнем неабходна прытрымлівацца наступных правілаў:

-пры ўдыху не паднімаць плечы, каб не было ключычнага дыхання;

-не перагружаць лёккія паветрам;

-пры ўдыху нельга поўнасцю расходваць усё паветра, заўседы павінен заставацца мінімальны запас;

-дыханне набіраць ціха, спакойна;

-пасля набору дыхання, неабходна яго на момант затрымаць;

## Тэма 5. Апора пеўчага голасу

Пеўчая апора – уменне падтрымліваць неабходны для гукаўтварэння падскладачны ціск выдыхаемага паветра. Апора павінна быць дастаткова пластычнай, упругкай, гібкай, актыўнай. Недахопы: «запіранне дыхання» - перанапружанне ўдыхацелей у час выдыху; «фарсіраванае дыханне» - празмерная актывізацыя дыхальных мышцаў.

Добра пастаўлены пеўчы голас стварае ў слухача адчуванне ўстойлівасці гучання, спакойнага голасаўтварэння, а сам спявак адчувае лёгкасць і стабільнасць працы галасавога апарата. Гэта дапамагае яму кіраваць голасам, спяваць не пераўтамляючы галасавыя складкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Апора-важнае адчуванне ў спевах, дзякуючы катораму спявак спакойна і свабодна карыстаецца сваім голасам. Пачуццё апоры ўзнікае не адразу, а па меры авалодвання тэхнікай спеваў, калі выканаўца паступова пачынае выяўляць найлепшыя якасці голасаўтварэння.

Пачуццё апоры фарміруецца ў кожнага спевака па-свойму і з'яўляецца следствам рацыянальнай работы галасавога апарата. Вось некаторыя адчуванні апоры гука ў спевакоў:

-своеасаблівае адчуванне слупа паветра, які падтрымліваецца знізу мышцамі дыяфрагмы і абапіраецца ў мяккае паднябенне;

-пэўная ступень напружанасці выдыхацельнай мускулатуры, якая падае неабходны паветраны ціск галасавым складкам;

-ступень супраціўлення галасавых складак падскладачнаму ціску.

Асноўны крытэрый пеўчай апоры –якасць гуку. Калі гук знаходзіць апору, спяваць становіцца лягчэй, напружанасць з гартані знімаецца, голасавядзенне становіцца свабодным, голас цалкам падпарадкоўваецца воле спевака, становіцца выразным, гук сабраным і багатым тэмбравымі фарбамі.

## Тэма 6. Рэгістры голасу

Рэгістр – паслядоўны рад аднародных гукаў, якія ўтвараюцца адным механізмам гукаўтварэння. Існуе два тыпа работы галасавых складак, якія называюцца рэгістрамі: галаўны і грудны. Але ёсць і трэці-змешаны (гучанне галаўнога і груднога рэгістра), які ад прыроды ёсць у дзіцячых і жаночых галасах. У працэсе навучання гэты рэгістр паяўляецца і ў мужчын. Гэта звязана з высокай пазіцыяй гуку (фальцэт).

*Галаўны рэгістр* – змыканне галасавой шчыліны не поўнае, галасавыя складкі вібрыруюць толькі свабоднымі сярэднімі краямі. *Грудны рэгістр* – поўнае змыканне галасавой шчыліны, складкі вібрыруюць ўсёй масай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прыродна пастаўленыя галасы вялікага дыяпазону гучаць роўна, шчыльна і маляўніча на працягу ўсяго дыяпазону. Тут не адчуваецца розніца паміж рэгістрамі, а назіраецца адзін тып гукаўтварэння. Арыентуючыся на прыродную пастаноўку голасу, спявак павінен дабівацца аднолькавага і роўнага гучання голасу і раскрыцця патэнцыяльных магчымасцей яго рэзаніравання на ўсёй працягласці дыяпазону, аб'ядноўваючы рэгістры. Спявак гэта робіць для таго, каб захаваць галаўное і груднoе рэзаніраванне на кожным гуку дыяпазону ў натуральнай, зручнай прапорцыі.

Грудныя рэзанатары знаходзяцца ніжэй галасавых складак. Груднoе рэзаніраванне, адчуванне вібрацыі ў груднoй клетцы суправаджае голасаўтварэнне. Рэзанатарныя адчуванні ў груднoй клетцы дакладна адчуваюцца спеваком, калі пакласці руку на грудную клетку. Для спевака груднoе і галаўное рэзаніраванне з'яўляецца індыкатарам правільнасці песеннага гуку, таму на адчуваннях рэзанансу неабходна спыняць увагу спевака пры ўдасканаленні выканальніцкім майстэрствам. Вельмі важна не скарачаць аб'ём груднoй клеткі пры дыханні, каб не знікаў каларыт груднога рэзаніравання.

На занятках па выканальніцкаму майстэрству асвойваюцца наступныя тыпы народнага гукаўтварэння:

- грудныя, адкрытыя спевы шырокага гучання у аўтэнтычнай манеры;

-акадэмізаваныя спевы выканаўцаў народнай песні з выкарыстаннем паўпрыкрытай тэхнікі гукаўтварэння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 7. Атака гуку

Пачатковы момант работы галасавых складак называецца атакай гуку. Яна ўздзейнічае на характар змыкання галасавых складак, тэмбр гуку, фарміраванне галосных. Неправільная атака - млявасць падачы, яго несабранасць, зажатасць, можа з'явіцца прычынай неправільнага інтаніравання.

Атака – пачатак гуку, які ўздзейнічае на характар змыкання галасавых складак, каардынацыю работы складак і дыхання, на якасць песеннага дыхання, тэмбр гуку, фарміраванне галосных. Фізіёлагі вызначаюць, што атака гуку – гэта спосаб і быстрыня, пры якіх дыхальная шчыліна пераходзіць ад дыхальнага становішча да галасавога, момант і ступень змыкання галасавых складак. Пры атацы гуку не павінна быць “пад'ездаў” і шумавых прыгукаў. Зычныя, якія стаяць перад галоснымі, вымаўляюцца дакладна і хутка.

Атаку гуку ўмоўна падзяляюць на тры тыпы: мяккая, цвёрдая і прыдыхальная. Мяккая атака, калі момант змыкання галасавых складак амаль супадае з пачаткам выдыху. Пры цвёрдай атацы галасавыя звязкі шчыльна змыкаюцца да пачатку выдыху; пры гэтым чутны характэрны прыгук. Прыдыхальная атака, калі змыканне галасавых складак адбываецца пасля пачатку выдыху, у выніку чаго перад гукам утвараецца прыдыханне ў форме зычнага *х*.

У песеннай выканальніцкай практыцы ўмацавалася ў якасці асноўнай формы гукаўтварэння мяккая атака гуку, якая захоўвае чысціню тэмбру і стварае ўмовы для эластычнай працы галасавых складак. Для стварэння мастацкага вобраза, дзякуючы заняткам па выканальніцкаму майстэрству, выкарыстоўваецца цвёрдая і прыдыхальная атака.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 8. Фарміраванне чыстай інтанацыі

Працэс фарміравання чыстай інтанацыі, як і працэс чыстых спеваў, з’яўляецца для выкананўцы крапатлівай слыхавой працай, што патрабуе пільнай ўвагі да прапявання кожнага гуку. Спевакі павінны адчуваць і ведаць, як правільна і чыста інтанацыйна праспяваць ноту. Уменне інтаніраваць чыста ступені лада, інтэрвалы, акорды, узятыя ў меладычным распалажэнні, называюцца меладычным (гарызантальным) строем; уменне

будаваць інтэрвалы і акорды ў адначасовым гучанні — гарманічным (вертыкальным) строем.

На занятках па выканальніцкім майстэрстве шмат народных песень спяваецца без суправаджэння і пры інтаніраванні абапіраюцца на асабістыя слыхавыя адчуванні і прадстаўленні ладатанальных гукавых зносін у мелодыі і гармоніі. У сувязі з гэтым вастрыня, дакладнасць і пэўнасць інтанацыі становяцца не толькі неабходным кампанентам выразнага выканання, але і сродкам умацавання чыстай інтанацыі. Праца над гарманічным і меладычным інтаніраваннем непасрэдна звязана з развіццём музыкальнага слыху. Спевакі павінны не толькі правільна ўзнавіць мелодыю, але і адчуць правільнасць гукаўтварэння, вышыню пазіцыі гуку, тэмбравы колер голасу.

Калі спевакі набудуць пачатковыя навыкі пры спевах з суправаджэннем музычнага інструмента (баяна ці фортэпіяна), можна паступова пераходзіць да спеваў без суправаджэння. Практыкаванні можна ўскладняць, паступова ўскладняючы рэпертуар.

Важным фактарам стварэння ўстойлівай інтанацыі — працэс "упявання" твора, які заключаецца ў паўторах і замацаванні мелодыі. Пры гэтым вырашаюцца мастацка-выканальніцкія задачы, ўстанаўліваюцца слыхавыя ўяўленні, набываецца неабходная ўпэўненасць і свабода ў выкананні.

### Тэма 9. Рэпертуар ансамбля народнай песні

Рэпертуар уздзейнічае на ўвесь вучэбна-выхаваўчы працэс. Гэта аснова, на якой назапашваюцца музычна-тэарэтычныя веды, выпрацоўваюцца вакальна-тэхнічныя навыкі і ўменні, складваецца мастацка-выканальніцкі кірунак творчай асобы, фарміруецца мастацка-вобразнае мысленне.

Задача рэпертуару – развіваць і ўдасканальваць музычна-вобразнае мысленне студэнтаў, яго творчую актыўнасць. Гэта магчыма ў тым выпадку,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

калі выкладчык прытрымліваецца прынцыпаў падбору рэпертуару і ўмела іх выкарыстоўвае ў вучэбнай дзейнасці.

Вельмі важна падабраць рэпертуар, які б адпавядаў асаблівасцям творчага накірунку фальклорнага калектыву. Такі падыход карысны тым, што дазваляе зрабіць разнастайнай рэпертуарную палітыку і выбраць адпаведныя галасавым магчымасцям і музыкальным здольнасцям народныя творы.

Рэпертуар павінен быць разнастайным па жанрах, па стылі, тэматыцы, вакальна-тэхнічным і мастацкім узроўні. Мэтазгодна ўключаць у рэпертуарны план творы, якія дапамагаюць вырашаць канкрэтныя вучэбныя задачы. Народны выканаўца павінен азнаёміцца з рэгіянальнымі выканальніцкімі стылямі, што існуюць у Беларусі. Для гэтага выкладчык павінен уключыць у яго вучэбную дзейнасць народныя песні розных песенных рэгёна, а таксама рознажанравыя народныя песні: каляндарна-абрадавыя, пазаабрадавыя народныя песні. Дасягнуўшы пэўных вынікаў у засваенні песеннага матэрыялу, падбіраюцца аўтарскія творы, напісаныя для народнага голасу, для вырашэння больш складаных выканальніцкіх задач.

Пры падборы рэпертуару для выканаўцы народнай песні асаблівую ўвагу неабходна звярнуць на песні без суправаджэння (a cappella). Спевы a cappella патрабуюць ад спевака высокай выканальніцкай культуры, тэхнічнага майстэрства і аказваюць моцнае эмацыянальнае ўздзеянне не толькі на слухачоў, але і на самiх выканаўцаў. Магчымасці спеваў без суправаджэння вельмі вялікія. Спевакі выпрацоўваюць вакальную тэхніку, удасканальваюць чыстую інтанацыю, слыхавую ўвагу, пачуццё ладу, меладычны слых. Спевы без суправаджэння дазваляюць адчуць выразнасць чалавечага голасу, яго тэмбральны колер, характар гукавядзення, здольнасць закрануць самыя патаемныя пачуцці слухачоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 10. Інтэрпрэтацыя беларускай народнай песні

Немалаважнымі задачамі на занятках па выканальніцкаму майстэрству з'яўляюцца навучанне перадачы сутнасці выконваемага твора, стварэнне багатых праўдзівых вобразаў. Удзельнікі вучэбнага калектыву павінны не толькі тэхнічна добра выканаць песню, але пастарацца як мага лепш раскрыць і перадаць ідэйна-мастацкі вобраз праз сваю інтэрпрэтацыю.

Абыякавая перадача мелодыі і тэксту, інакш кажучы, спевы, дзеля таго, каб проста праспяваць, пакідаюць дрэнныя ўражанні, нягледзячы на наяўнасць у выканаўцы добрых галасавых даных і ўмела падабранага рэпертуару. Такое выкананне не можа мець ніякай мастацкай каштоўнасці і не можа прынесці эстэтычную асалоду слухачу.

Інтэрпрэтацыя народнай песні і творчы падыход да яе выканання – няпростая задача. Авалоданне выканальніцкім майстэрствам вядзецца на працягу як усяго навучання, так і ў далейшым творчым жыцці выканаўцаў. Гэты працэс уключае ў сябе агульнае эмацыянальнае становішча спевака, яго псіхалагічны склад характару, жыццёвы вопыт, агульную і прафесійную адукаванасць, а таксама асабісты густ, музыкальнасць, светапогляд, веданне народна-песенных традыцый, акцёрскае майстэрства.

Шматлікія крыніцы па праблемах музычнай педагогікі апісваюць розныя метадычныя кірункі па авалоданні мастацка-вобразнай перадачай выконваемага твора. Нельга забываць знакамітыя прынцыпы К.С. Станіслаўскага, заснаваныя на выхаванні сапраўды праўдзівага, свабодна і шчыра дзеючага акцёра. К.С. Станіслаўскі валодаў "абсалютным рэжысёрскім слыхам, абсалютным пачуццём "сцэнічнай праўды", і калі на рэпетыцыях гучала знакамітае "не веру", пошукі сцэнічнай праўды працягваліся. Асновай творчага метаду К.С.Станіслаўскага з'яўлялася пранікненне ва ўнутраны свет музыкі, пераўтварэнне яго акцёрам у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сцэнічнае дзеянне, якое накіроўвалася на праўдзівае адлюстраванне пастаўленай сцэнічнай задачы.

Для народна-песеннага мастацтва праўдзівая інтэрпрэтацыя патрабуе глыбокага і ўдумлівага разумення тэксту і мелодыі народнай песні. Дасканалае вывучэнне жанравай прыналежнасці, стылёвых асаблівасцей і асаблівасцей мовы, азнаямленне з фоназапісамі, калі яны існуюць, непасрэдныя зносіны з носьбітамі фальклорных традыцый – тыя шляхі, якія дапамогуць народным выканаўцам ўзбагаціць унутраны светапогляд, пашырыць веды, пераняць манеру спеваў, стварыць умовы для творчай працы.

Працу над мастацка-вобразным увасабленнем песні неабходна пачынаць з трактоўцы музычнага тэксту, у якім ўжо закладзены характар выканання, тэмпарытм, дынамічныя адценні. Творчая праца над інтэрпрэтацыяй народнай песні палягчаецца тым, што стваральнік песні ( народ ці кампазітар) ужо пабудаваў умовы для ўзнаўлення свайго твора, і выканаўцу застаецца толькі “адрэдагаваць” прапанаваны матэрыял.

Выканальніцкае майстэрства спевака — гэта ўменне валодаць рознымі відамі гукавядзення, вакальна-тэхнічнымі прыёмамі, правільна выкарыстоўваць тэмбравыя адценні і дынаміку. Праца над народнай песняй адбываецца на падставе асэнсаванага падыходу да вакальнай культуры і фарміруецца праз суб’ектыўныя адносіны да яе выканання.

Такім чынам, творчы працэс над інтэрпрэтацыяй народнай песні на занятках па выканальніцкаму майстэрству падзяляецца на некалькі этапаў:

- праца над авалодваннем народна-выканальніцкімі прыёмамі,  артыстычнай індывідуальнасці,  над элементамі пластыкі;
-засваенне і раскрыццё драматургіі песні;
- падбор і праца над рэпертуарам;
-спроба імправізацыі і самастойная рэжысура песні.
- пошук свайго выканальніцкага крэда, актыўны ўдзел у канцэртах, назапашванне  рэпертуару.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Тэма 11. Метады фарміравання навыкаў рэпетыцыйнай работы

На занятках па дысцыпліне “Выканальніцкае майстэрства” перад тым, як прыступіць да практычнай раблты з вучэбным калектывам, неабходна у классе з выкладчыкам распрацаваць план правядзення і паслядоўнасць рэпетыцый работы.

Першыя 10 мінут заняткаў адводзіцца распяванню, дыхальным практыкаванням і выпрацоўцы вакальных навыкаў.

Азнаямленне з музычным матэрыялам адбываецца шляхам салфеджыравання кожнай партыі асобна. Пасля азнаямлення з мелодыяй дырыжор павышае патрабаванні. Неабходна звярнуць увагу на правільную інтанацыю, правільнасць мелодыі, рытмічны малюнак. Ніводная недакладнасць не павінна быць прапушчана. Калі ўдзельнікі вучэбнага калектыву дасягнуць упэўненасці ў спевах сваіх харавых партый, дырыжор павінен праверыць засвоены матэрыял.

Наступны этап – гэта ўдасканальванне музычнага матэрыялу. Пераходны момант ад сольфеджырования – спевы на склады, на якіх адбываецца «упеванне» вакальных пазіцый і фарміраванне будучага тэмбравага колеру. Працягваецца праца над харавым ансамблем і строем, фразіроўкай, паэтычным тэкстам. Далей вядзецца работа над музычнай фактурай (мелодыка, рытм, тэмп, дынаміка), а таксама над вакальнымі сродкамі выразнасці (гукаўтварэннем і гукавядзеннем, штрыхамі, тэмбрам).

Апошняя стадыя - удасканальванне кампанентаў і збіранне іх у адно цэлае.

Дырыжор, праводзячы рэпетыцыю, павінен:

– прыходзіть раней на рэпертыцыю;

– быць заўсёды сабраным, акуратным, накіраваным на працу;

– захоўваць паважлівы тон. ствараць добрыя працоўныя абставіны;

– не размаўляць і не перашкаджаць працаваць астатнім студэнтам;

– задавать тон правільна і зразумела;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– показываць голасам інтанацыйна правільна і выразна;
– не паўтараць музычны твор без канкрэтных задач і выпраўленню памылак ;
– не прытамляць галасы і рэпетыраваць музычныя кавалкі з высокай цесітурай на полтона ці на тон ніжэй;
– дырыжыраваць дакладна і ясна.

Выкладчык павінен прысутнічаць на занятках, сачыць за работай вучэбнага калектыву. Кожныя заняткі неабходна аналізаваць, выяўляць недахопы і станоўчыя моманты, вызначаць праблемы, акрэсліваць задачы і план наступных рэпетыцый. Знаходзіць шляхі і метады паляпшэння работы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 3.1 Змест работы студэнтаў па матэрыялу вучэбнай дысцыпліны “Выканальніцкае майстэрства”:

**Тэма 1. Народная манера спеваў, як комплекс вакальна-выканальніцкіх сродкаў і прыёмаў**

**1.1 Пытанні для канролю**

1. Песенная ўстаноўка. Задачы распеўкі
2. Формы і спосабы работы над дыкцыяй, словам, тэмбрам, фактурай, асаблівасцямі рытма-акцэнтнай арганізацыі песеннага тэкста
4. Засваенне правільнага гукаўтварэння
5. Выпрацоўка адзінай манеры спеваў
6. Згладжванне і спалучэнне рэгістраў
7. Спецыфічныя формы выразнасці спеваў
8. Выпрацоўка чыстай і дакладнай інтанацыі. Харавы строй, ансамбль

**1.2 Заданні для самастойнай работы**

1. Зрабіць аналіз харавой партытуры
2. Вызначыць асаблівасці меладычнага матэрыялу, факутуры ізлажэння

**Літаратура:**

1. Грамовіч, І.М., Снапкова Л.В. Методыка работы з народным хорам:курс лекцый /І.М. Грамовіч, Л.В. Снапкова.-Мн.: Бел.дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009.-139.

2.Емельянов, В.В. Фонопедический метод формирования певческого голосообразования/ В.В.Емельянов.-Новосибирск:Наука:Сибирское отд.,1991.-39с.

3.Малышева, Н.М. О пении / Н.М. Малышева. —М.: Сов. композитор,1988.—135с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Мешко, Н.К. Искусство народного пения. Практическое рук-во и методика обучения искусству народного пения / Н.К.Мешко.— М.: ЛУЧ.—Ч . 2.— 2000 .—80 с.17.
5. Руднева, А.В. Русский народный хор и работа с ним / А.В. Руднева. – М.: Сов. Россия, 1974. -- 49 с.
6. Савельева, В.П. Проблемы вокального обучения руководителей народных хоров / В. П. Савельева // Вопросы хорового образования: Сб. тр. / М-во культуры РСФСР, Гос. Муз.-пед. ин-т. – М., 1985. – Вып. 77. -- 120 с .
7.Холупава, Л.І. Пастаноўка голасу і вакальны ансамбль: вучэб. дапам./ Л.І. Холупава, І.М. Грамовіч, Л.Л. Ражкова.- Мн.: Бел.дзярж.ун-т культуры і мастацтваў, 2008.-189с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 2. Работа над мастацкім вобразам

**3.1 Пытанні для кантролю**

1. Асноўныя прынцыпы стварэння мастацкага вобраза
2. Работа над нюансамі і дынамічнымі адценнямі: piana, pianissimo, forte, sp
3. Філіроўка гуку
4. Метады работа над тэмпамі у песне
5. Работа над штрыхамі: legata, non letgata, staccato, marcata.
6. Творы з суправаджэннем. Засваенне навыкаў і ўменняў спеваў народных песень без суправаджэння

**3.2 Заданні для самастойнай работы**

1. Падрыхтаваць план работы над мастацка-выразнымі сродкамі у народнай песне
2.Падабраць песенны матэрыял для спеваў без суправаджэння і з суправаджэннем

**3.3 Літаратура:**

1. Грамовіч, І.М., Снапкова Л.В. Методыка работы з народным хорам:курс лекцый /І.М. Грамовіч, Л.В. Снапкова.-Мн.: Бел.дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009.-139.
2.Малышева, Н.М. О пении / Н.М. Малышева. —М.: Сов. композитор,1988.—135с.
3. Мешко, Н.К. Искусство народного пения. Практическое рук-во и методика обучения искусству народного пения / Н.К.Мешко.— М.: ЛУЧ.—Ч . 2.— 2000 .—80 с.17.
4. Руднева, А.В. Русский народный хор и работа с ним / А.В. Руднева. – М.: Сов. Россия, 1974. -- 49 с.
5. Шамина Л.В. Вопросы хорового образования/ Л.В Шамина.-М., 1985.-Вып.77.-148с.
6. Холупава, Л.І. Пастаноўка голасу і вакальны ансамбль: вучэб. дапам./ Л.І. Холупава, І.М. Грамовіч, Л.Л. Ражкова.- Мн.: Бел.дзярж.ун-т культуры і мастацтваў, 2008.-189с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тэма 3. Спецыфіка работы над музычна-харэаграфічнай кампазіцыяй**

**3.1 Пытанні для кантролю**

1. Беларускі народны танец і яго выкарыстанне у народнай песне
2. Элементы сучаснай харэаграфіі ў народнай песне і засваенне асноў сцэнічнага руху
3. Сцэнічная інтэрпытацыя народных песень, прынцыпы развіцця пластыкі, суадносіны рытму, руху і характара крокаў, выкарыстанне атрыбутыкі (касцюмаў, бутафорыі і інш.)
4.Узаемасувязь харэаграфіі з інструментальнай музыкай і песеннымі формамі

5. Работа над вакальна-харэаграфічнымі кампазіцыямі па матывах народных каляндарана-абрадавых і пазаабрадавых песень.

**3.2 Заданні для самастойнай работы**

1. Распрацаваць танцавальныя схемы беларускіх календарных абрадаў

2. Падрыхтаваць сцэнічнае вырашэнне заданай вакальнай кампазіцыі

3. Падрыхтаваць харэаграфічнае рашэнне вакальнага твору

**3.3 Літаратура:**

1. Руднева, А.В. Русский народный хор и работа с ним / А.В. Руднева. – М.: Сов. Россия, 1974. -- 49 с.

2. Шамина,Л.В. работа с самодеятельным коллективом/Л.В. Шамина.-М.: Музыка, 1983.-173с.

3. Чурко, Ю М. Белорусский хореографический фольклор/Ю.М. Чурко.-Мн.:Выш.шк.1990ю-415с.: ил.

**Тэма 4. Авалодванне майстэрствам імправізацыі**

**4.1 Пытанні для кантролю**

1. Роля імправізацыі ў народна-песенным выканальніцтве

2. Авалодванне навыкамі распеваў "з падводкай", "з пералівамі",рознымі відамі шматгалосся

3. Метады развіцця музыкальнага слыху і слыхавога ўспрыяцця

4. Асаблівасці фактуры харавых партытур розных рэгіёнаў Беларусі

**4.2 Заданні для самастойнай работы**

1. Падрыхтаваць узоры мелодый для спеваў з ужываннем розных відаў шматгалосся

2. Зрабіць параўнальны аналіз рэгіянальных стылёвых асаблівасцей народна-песеннага выканальніцтва Беларусі

**Літаратура:**

1. Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Гомельская вобласць / укл. В.А. Захарава, Р.М. Кавалёва, В.Д. Ліцвінка. – Мн . : Універсітэцкае, 1989.—384 с.

2. Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Мінская вобласць / укл. В.Д. Ліцвінка, Г.Д. Кутырова. – Мн .: Універсітэцкае, 1995.—250 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Варфаламеева, Т. Б. Песні беларускага Панямоння / Т.Б.Варфаламеева.— Мн.: Бел.навука, 1980.— 220с.
4. Кабанов, А.С. К проблеме сохранения фольклорных традиций в современных условиях/А.С Кабанов//Художественная самодеятельность: вопросы развития и руководства: Сб.тр./Науч. исслед. ин-т культуры М-ва культуры РСФСР.-М., 1980.-вып.88-с.80-106.
5. Можэйко, З.Я. Песенная культура белорусскага Полесья: Село Тонеж / З.Я. Можейко.-Мн.:Наука и техника, 1971.-263с.

## Тэма 5. Засваенне рэгіянальных выканальніцкіх народна-песенных традыцый

### 5.1 Пытанні для кантролю

1. Аўтэнтычная манера спеваў і яе асаблівасці
2. Сувязь народнай манеры спеваў з асаблівасцямі дыялекту, музычнай мовы і выканальніцкага вопыту пакаленняў народных спевакоў адной мясцовасці
3.Набыццё навыкаў і уменняў выканання вакальнай мелізматыкі: глісандзіраванне, спады голасу, скідванне, пад'езды гуку, слізганне, зацягванне апошняга гука, вымаўленне апошняга гука гаварком і інш.

### 5.2 Заданні для самастойнай работы

1. Праслухаць аўдыёзапісы і зрабіць параўнальны аналіз песеннага матэрыялу рэгіёнаў Панямоння, Падняпроўя, Цэнтральнага рэгіёна, Брэсцкага і Гомельскага Палесся
2. Падрыхтаваць для развучвання па адной народнай песне з кожнага рэгіёна

### 5.3 Літаратура:

1. Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Гомельская вобласць / укл. В.А. Захарава, Р.М. Кавалёва, В.Д. Ліцвінка. – Мн . : Універсітэцкае, 1989.—384 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Мінская вобласць / укл. В.Д. Ліцвінка, Г.Д. Кутырова. – Мн .: Універсітэцкае, 1995.— 250 с.
3. Варфаламеева, Т. Б. Песні беларускага Панямоння / Т.Б.Варфаламеева.— Мн.: Бел.навука, 1980.— 220с.
4. Варфоломеева Т.Б. Северобелорусская свадьба / Т.Б.Варфаламеева. — Мн.: Наука и техника, 1988.—154с.
5. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў.у 6 т.Т.6. Гомельскае Палессе і Падняпроўе.У.2 кн Кн.1/Т. В.Валодзіна [ і інш.]; ідэя і агул. Рэдагаванне Т.Б Варфаламеева.-Мінск: Выш.шк., 2012.-910с..6каляр.іл.
6. Можэйко, З.Я.Календарно-песенная культура Белоруссии: Опыт системнотипологического исследования / З.Я. Можейко.- Мн.: Наука и техника, 1985.-248с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Тэма 6. Асаблівасці работы над тэкстам народнай песні

**6.1 Пытанні для кантролю**

1. Асаблівасці літаратурнага вымаўлення тэкста народнай песні
2. Дыялектныя асаблівасці рэгіянальных гаворак Беларусі
3. Выкарыстанне спецыфічных вымаўленчых прыёмаў пры развучванні паэтычнага тэксту народных песень

**6.2 Заданні для самастойнай работы**

1. Падрыхтаваць беларускія народныя песні, у якіх адлюстроўваюцца дыялектныя асаблівасці рэгіянальных гаворак
2. Падрыхтаваць народныя песні з літаратурным вымаўленнем тэксту і вызначыць асаблівасці арфаэпіі

**6.3 Літаратура:**

1. Грамовіч, І.М., Снапкова Л.В. Методыка работы з народным хорам:курс лекцый /І.М. Грамовіч, Л.В. Снапкова.-Мн.: Бел.дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009.-139.

2. Артеменко, Е.Б. Принципы народно-песенного текстообразования/ Е.Б. Артеменко.-Воронеж: Изд-во Воронеж. Ун-та, 1988.-173с.
3. Крывіцкі, А.А. Сучасная беларуская літаратурная мова і народныя гаворкі /А.А. Крывіцкі А.А.// Т-ва па распаўсюджванню паліт. і навук. Ведаў БССР.-Мн., 1961.-40с.
4. Шаталава, Л.Ф. Беларускае дыялектнае слова/Л.Ф. Шаталава.- Мн.: Навука і тэхніка, 1975.-208с.
5. Калугина, Н.В. Методика работы с русским народным хором: Учеб. для муз. вузов / Н.В. Калугина.-М., 1969.- Вып.1.- 38с.
6. Шамина,Л.В. работа с самодеятельным коллективом/Л.В. Шамина.-М.: Музыка, 1983.-173с. 6.Холупава, Л.І. Пастаноўка голасу і вакальны ансамбль: вучэб. дапам./ Л.І. Холупава, І.М. Грамовіч, Л.Л. Ражкова.- Мн.: Бел.дзярж.ун-т культуры і мастацтваў, 2008.-189с.

**Тэма 7. Сцэнічнае вырашэнне і інтэрпрэтацыя народнай песні**

**7.1 Пытанні для кантролю**

1. Выкарыстанне і работа з фальклорным і аўтарскім музыкальна-песенным матэрыялам
2. Рэжысура канцэртнага нумару : ідэйная накіраванасць, развіццё агульнай драматургічнай стужкі, завязка, кульмінацыя і фінал, лагічнае выкарыстанне харэаграфіі і персанажаў народных абрадаў
6. Пастаноўка народнага абрадавага дзеяння
7. Прынцыпы рэпетыцыйнай работы
8. Прынцыпы падбору рэпертуара
9. Распрацоўка сцэнарнага плана канцэртнай праграмы. Падрыхтоўка матэрыялаў: аналіз і абмеркаванне, выбар і замацаванне
10. Падрыхтоўчая работа і авалодванне навыкамі запісу песеннага матэрыялу ў гуказапісываючай студыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**7.2.Заданні для самастойнай работы**

1. Падрыхтаваць план рэпетыйнай работы

2. Распрацаваць сцэнарны план канцэртнай праграмы

3. Распрацаваць сцэнарны план па заданай тэме абрадавага дзеяння

**7.3 Літаратура:**

1. Веснавыя песні / рэд. К.П. Кабашнікаў.— Мн .: Навука і тэхніка, 1979.— 608 с.

2. Вянок беларускіх народных песень / запіс У. Раговіча.— Мн.: Навука і тэхніка,1988.—432с.

3. Вяселле: Абрад / укл. К.А. Цвірка.— Мн.: Бел. навука,—2004.— 683с.

4. Гульні, забавы, ігрышчы / укл. А.Ю. Лозка.—Мн.:Бел.навука, 2003.—534с.

5. Калугина, Н.В. О работе с хором русской народной песни: В помощь руководителю самодеятельности/Н.В. Калугина.-М., 1969.- Вып.1.- 38с.

6. Калугина, Н.В. Методика работы с русским народным хором: Учеб. для муз. вузов / Н.В. Калугина.-М., 1969.- Вып.1.- 38с.

7. Шамина,Л.В. работа с самодеятельным коллективом/Л.В. Шамина.-М.: Музыка, 1983.-173с.

**Тэма 8. Арганізацыйныя формы выканальніцкай дзейнасці**

**8.1 Пытанні для кантролю**

1.Формы і задачы выканальніцкай дзейнасці фальклорнага калектыву (асветніцкія, маральна-выхаваўчыя, мастацка-эстэтычныя, сацыякультурныя)

2.Прынцыпы арганізацыі і сцэнічнае рашэнне канцэрта, фестываля, творчага паказу.

3. Асновы мастацкай інтэрпрэтацыі музычных твораў

4. Самастойнае выкарыстанне выяўленчых сродкаў для перадачы мастацкага вобраза народнай песні

5. Адзнака дзейнасці розных творчых калектываў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. Прагляд и знаёмства з аўдыё- і відыё- матэрыяламі фальклорных фестываляў, канцэртаў, конкурсаў, запісаў матэрыялаў экспедыцый, майстар-класаў

7. Перайманне вопыту вядучых спецыялістаў у вобласці народна-песеннага выканальніцтва.

**8.2.Заданні для самастойнай работы**

1. Распрацаваць план правядзення рэпетыцыі

2. Зрабіць сцэнарый канцэртнага выступлення

**8.3. Літаратура:**


1. Грамовіч, І.М., Снапкова Л.В. Методыка работы з народным хорам:курс лекцый /І.М. Грамовіч, Л.В. Снапкова.-Мн.: Бел.дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009.-139.

2. Руднева, А.В. Русский народный хор и работа с ним / А.В. Руднева. – М.: Сов. Россия, 1974. -- 49 с.

3. Шамина,Л.В. работа с самодеятельным коллективом/Л.В. Шамина.-М.: Музыка, 1983.-173с.

4. Чурко, Ю М. Белорусский хореографический фольклор/Ю.М. Чурко.-Мн.:Выш.шк.1990ю-415с.: ил.

5.Холупава, Л.І. Пастаноўка голасу і вакальны ансамбль: вучэб. дапам./ Л.І. Холупава, І.М. Грамовіч, Л.Л. Ражкова.- Мн.: Бел.дзярж.ун-т культуры і мастацтваў, 2008.-189с.


## 3.2. Метадычныя ўказанні выкладчыкам

ВМК змяшчае патрабаванні па фарміраванні акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных кампетэнцый, а таксама матэрыялы, рэкамендаваныя для выканання на заліках, кантрольных уроках і іспытах.

Прапанаваны рэпертуарны спіс з’яўляецца прыкладным і можа змяняцца з боку выкладчыка ў адпаведнасці з іх метадычнымі ўстаноўкамі, а таксама магчымасцямі і здольнасцямі студэнтаў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У рабоце са студэнтамі выкарыстоўваюцца практычныя заняткі ў форме рэпетыцый, якія праводзяцца ў групах, сфарміраваных са студэнтаў усіх курсаў. Змест практычных заняткаў залежыць ад канкрэтных творчых задач і ўключаюць у сябе сумесную работу выкладчыка і студэнтаў над музычным творам. З мэтай дасягнення найлепшых вынікаў па засваенні вучэбнай дысцыпліны выкладчык ажыццяўляе праверку самастойнай работы і дае парады і рэкамендацыі па яе ўдасканаленню.

У лік эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць эфектыўнаму засваенню ведаў, неабходна выдзеліць тэхналогію праблемна-модульнага навучання, а таксама камунікатыўныя тэхналогіі. У працэсе навучання неабходна ўлічваць індывідуальныя асаблівасці студэнта, яго музычныя і вакальныя даныя і ўзровень падрыхтоўкі. У рабоце са студэнтамі неабходна прытрымлівацца асноўных прынцыпаў навучання: паслядоўнасці, паступовасці, даступнасці, нагляднасці, а таксама спалучаць моўнае тлумачэнне матэрыялу з наглядным паказам.

Вучэбная работа на занятках па вучэбнай дысцыпліне «Выканальніцкае майстэрства" падзяляецца этапы ў якіх вырашаюцца пэўныя педагагічныя задачы:

Задачай першага этапа з'яўляецца вывучэнне і засваенне тэарэтычных асноў выканальніцкага майстэрства. Задачай другога гэтага этапа з'яўляецца стварэнне музыкальна-слыхавых уяўленняў у узнаўленні музычна-песеннагак матэрыялу. У данным ракурсе музыкальнасць выступае як складаная сістэма, якая ўключае ў сябе ўзаемадзеянне музычнага слыху, музычнай памяці, галасавых здольнасцей, эмацыянальных якасцей выканаўцы, музычнага мыслення і ўяўлення, музыкальнасці. Мэтай трэцяга этапа з'яўляецца развіцце навыкаў выканальніцкага майстэрства і уключае ў себя індывідуальную работу над творам. На даным этапе неабходна навучыць студэнта ўжываць атрыманыя тэарэтычныя веды ў практычнай дзейнасці і адапціраваць іх у канкрэтных пэўных вытворчых сітуацыях.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Форма індывідуальнай работы са студэнтамі ўключае ў сябе развучванне музычнага матэрыялу, работу над фразіроўкай, дыкцыяй, інтанацыяй, выразнымі сродкамі, метра-рытмам, адзінай манерай спеваў.

Чацьверты этап уключае работу над рухамі і прадугледжвае бездакорнае валоданне тэхнікай спеваў з рухамі. Важную ролю тут іграе якасць засваення харэаграфічных рухаў і пластыкі, пачуццё рытму, дынамікі выканання твора, каардынацыя спеваў і рухаў. Задача данага этапу – даць студэнту веды аб пластычным вырашэнні музычна-песеннага матэрылу, улічваючы народныя традыцыі ў інтэрпрэтацыі песні.

Задачай пятага этапа з'яўляецца стварэнне вобраза на падставе сумеснай работы выкладчыка і студэнта над трактоўкай твора. Важным фактарам, які садзейнічае паспяховай арганізацыі вучэбнага працэса, неабходна лічыць правільны падбор музычна-песеннага матэрыялу. Студэнту прапануецца розны па жанравай прыналежнасці песенны матэрыял: календарна-абрадавыя, сямейна-бытавыя, пазаабрадаввыя народныя песні, а таксама песні, створаныя кампазітарамі для выканання народным голасам. Важна ўмела спалучаць розныя па складанасці песні і выкарыстаць розную сцэнічную інтэрпрэтацыю.

Асаблівую ролю ў творчым развіцці студэнтаў іграюць такія віды дзейнасці, як падбор рэпертуару, арнжыроўка песні, валоданне навыкамі імправізацыі. Творчая дзейнасць развівае музыкальна-слыхавыя, каардынацыйныя, рытмічныя здольнасці студента. Для фарміравання навыкаў чыстага інтаніравання неабходна дакладна вывучыць музычны матэрыял, валодаць выканальніцкай тэхнікай. Расклад мелодыі на галасы і імправізацыя патрабуюць пачуццё стылістыкі выконваемага твора, развіццё гарманічнага слыху.

Вельмі важна звярнуць увагу на асэнсаванне тэкста песні, яе фразіроўку, гукавядзенне, суадносіны з рухамі, стылявыя суадносіны, агогіку і іншыя выразныя сродкі. Глыбокія веды народна-песенных традыцый павінны сказвацца на агульнай інтэрпрэтацыі народна-песеннага матэрыялу.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Студэнт павінен дасканала азнаёміцца з прыёмамі апрацоўкі музычна-песеннага матэрыялу, аўтэнтычнымі узорамі, вызначыць характар і жанр песні, вызначыць фактуру ізлажэння.

Для авалодання навыкамі імправізацыі неабходна развіваць гарманічны слых, пачынаючы з простых песенных мелодый. Рашаючае значэнне адыгрывае ўнутраны слых. Неабходна спяваць інтэрвалы, спачатку секунду, потым тэрцыю, кварту і г.д.

Выканальніцкае майстэрства спевака шчыльна звязана з акцёрскім майстэрствам: паводзіны на сцэне, культура рухаў, тэхніка харэаграфіі, сцэнічная і песенная ўстаноўка.

Выканальніцкае майстэрства прадугледвае:

-авалодванне навыкамі народна-песеннага выканальніцтва;

-выхаванне пластычнай культуры рухаў і натуральнага гучання голасу;

-асваенне асноўных танцавальных прыёмаў у спалучэнні са спевамі;

-уменне свабодна трымацца на сцэне;

-эмацыянальна, неабыякава паводзіць на сцэне;

-выразна перадаваць сэнс народных песень;

-ажыццяўляць рэжыссуру нумара.

## 3.3. Метадычныя ўказанні па арганізацыі самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа па дысцыпліне «Выканальніцкае майстэрства» уключае вывучэнне музычнага матэрыялу (вакальных партый харавых і ансамблевых твораў), танцавальных рухаў.

Этапы самастойнай работы над засваеннем вакальна-харавога твору:

- разбор музычнага матэрыялу;

-знаёмства з творчасцю кампазітара, аўтарам тэксту;

-мастацкае афармленне музычнага твору;

-стварэнне мастацкага вобраза, інтэрпрэтацыя народнай песні;

-харэаграфічнае афармленне і пастаноўка з рухамі;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

-канцэртнае выкананне: завяршэнне работы над творам, вызначэнне памылак, рэжысёрскае вырашэнне.

Пачатковы этап работы прадугледжвае візуальнае знаёмства з творам: выяўленне танальнага плана, фактуры ізлажэння, памера, тэмпу, асаблівасцей голасавядзення, музычнай формы, дыяпазону вакальнай партыя, цесітуры, дынамічных адценняў, характару выканання. Важна вывучыць і прааналізаваць дынамічныя адценні, нюансы, цэзуры, дыханне. Самастойнае вывучэнне творчасці кампазітара, выяўленне рэгіянальнай прыналежнасці народнай песні дапамагае студэнту самастойна зразумець стылістыку твора, раскрыць жанравую прыналежнасць песні.

Работа над вакальным творам павінна ўключаць работу над паэтычным тэкстам. Асэнсаванае і эмацыянальнае разуменне сэнса песні праз мову неабходна для раскрыцця мастацкага вобраза. Студэнту неабходна самастойна праінтаніраваць мелодыю з тэкстам, вызначыць кульмінацыйныя моманты, цяжкасці вымаўлення, паўзы, лагічныя націскі, фразіроўку, дыкцыённыя асаблівасці.

<u>Прыкладны план самастойнай работы над музычным матэрыялам</u>:

1. Азнаямленчы візуальны аналіз:

– назва песні, вызначэнне аўтара слоў і музыкі;

– абазначэнне характару і тэмпа выканання;

–выразнае чытанне літаратурнага тэкста песні (асэнсаванне зместу, характара і выкананння).

2. Вызначэнне жанра твора і музычнага стылю:

– народная песня (аўтэнтычная);

-апрацоўка народнай песні;

– аўтарская песня для народнага хору ці фальклорнага ансамбля.

3. Візуальны аналіз нотнага тэкста:

– ключы, знакі альтэрацыі, танальнасць;

– памер, рытмічныя асаблівасці ізлажэння харавых партый;

– фактура ізлажэння музычнага матэрыялу;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– малюнак  вакальнай мелодыі;

– нюансіроўка, тэмпы, дыханне, змена памера і іншыя аўтарскія ўказанні ў запісе нотнага тэкста;

– форма песні і асаблівасці ізлажэння харавога матэрыялу ў адпаведнасці з формай;

-харавы твор з суправаджэннем і без суправаджэння (a cappella).

4. Работа над вывучэннем вакальна-харавога матэрыяла:

– сальфеджыраванне з такціраваннем;

– асэнсаванне метрычнай структуры, асэнсаванне рытмічнага малюнка;

– выяўленне розных рытмічных і вакальных цяжкасцей;

– работа над фразіроўкай, растаноўка дыхання.

**3.4. Рэкамендаваны рэпертуарны спіс:**

1. Калі каліна не цвіла бел.нар. песня ў апр. А.Казака
2. Ой, на горке каліна бел.нар. песня ў апр. Л. Ражковай
3. Як на рэчачцы на дошчачцы бел. нар. песня ў апр. В. Калацэя
4. Пайду на рэчку апр. М Сіраты
5.  Як вывіду луку бел.нар. песня ў апр. У. Васючкова
6. За ліхімі за марозамі бел. нар. песня ў апр. М. Сіраты
7. Песня беларуская мая муз. А. Шурмана
8. Карасі муз. Я. Дзеравянкі
9. Роднае сяло муз. Я. Дзеравянкі
10. Лебедзь белы бел.нар. песня ў апр. А. Клеванец
11. З пад белага камушка  бел. нар. песня ў апр. А. Рашчынскага
12.Лятуць, лятуць два лебедзі бел. нар. песня ў апр. А. Рашчынскага
13.Ой, ты грушка мая бел. нар. песня ў апр. М. Дрынеўскага
14.Ой, прачнуся я ў панядзелак бел. нар. песня ў апр. І. Грамовіч
15. Чом-чом пад карчом бел.нар. песня ў апр.  М. Сіраты
16. Ці я ў полі не жнеечка. Музыка Я. Дзеравянкі. Словы народныя.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

17. Ой, калі ж той вечар бел.нар. песня ў апрацоўка М. Сіраты.

18. Мора, мора бел.нар. песня ў апр.  М. Сіраты.

19. Ой, зашумелі мухі-камары. Апрацоўка М. Сіраты.

20. Бульба-бульбачка. Музыка Я. Дзеравянкі. Словы І. Цітаўца.

21. Бацькаўшчына. Музыка Л. Мурашкі. Словы У. Караткевіча.

22. Напішы мне, салдат. Музыка А. Чыркуна. Словы А. Ставера.

23. Усё тут сэрцу блізка. Музыка Ю. Семянякі. Словы У. Карызны.

24. Матулін край. Музыка Э. Наско. Словы В. Аколавай.

25. Дзяўчыне любы гарманіст. Музыка У.Сарокіна. Словы В. Жуковіча.

26.Не раўнуй. Музыка А. Канстанцінавай. Словы В. Жуковіча.

27.Ой, Сымонка. Музыка  Л. Захлеўнага. Словы В. Жуковіча.

28. Добрай вам жа, маладзёначкі бел.нар песня ў апр. М. Сіраты

29. Вянок вясенніх песень: Вясна, вясна,вясняначка, Ой. Ты вясна, ты красна, Вясна-красна наставала ў апр. М. Сіраты

30. Вянок купальскіх песень Зара мая вячэрняя, Пойдзем дзевачкі, Пасею я лён у апр. М. Сіраты

31. На вуліцы, на шырокай бел. нар. песня ў апр. К. Яськова

32. У нас сягоння Купалачка бел. нар. песня ў апр. У. Раговіча

33. Вянок жшіўных песень  Наша жыта усё паспела, Жыта яравое, Жніця жнейкі ў апр. А. Клеванца

34. Ці ўсе дзеўкі выйшлі бел. нар. песня ў апр. А. Рашчынскага

35. Пойдзем дзевачкі бел нар. песня ў апр. У. Зяневіча

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 4. РАЗДЗЕЛ КОНТРОЛЯ ВЕДАЎ

## 4.1 Заданні для контралюемай самастойнай работы студентаў

У тэматычным плане вучэбнай дысцыпліны «Выканальніцкае майстэрства» прадугледжана контралюемая самастойная работа студэнтаў па вывучаемых тэмах, накіраваных на фарміраванне уменняў ужываць атрыманыя тэарэтычныя веды ў практычнай рабоце і адапціраваць іх у творчай дзейнасці. Такая самастойная работа прадугледжвае выкананне творчых заданняў, кантроль якой ажыццяўляецца адпаведна вучэбна-метадычнай карце вучэбнай дысцыпліны на кантрольным занятку, заліке і іспыце.

**Заданне 1. Зрабіць азнаямленчы візуальны аналіз і разабраць музычны тэкст вакальна-харавых твораў**

Колькасць гадзін – 2.

Форма контроля ведаў па семестрам – контрольный урок.

Студэнт павінен зрабіць азнаямленчы візуальны аналіз прапанаваных выкладчыкам харавых твораў. Азнаёміцца з аўтарам музыкі ці апрацоўкі народнай песні, аўтарам слоў. Вызначыць тэмп, рытм, характар выканання. Асэнсаваць змест літаратурнага тэксту, прааналізаваць дыялектныя асаблівасці (калі ёсць). Вывучыць меладычны малюнак і вакальныя партыі.

Наглядна прадэманстраваць вывучаны напамяць матэрыял.

**Заданне 2. Вызначэнне жанра вакальна-музычнага твора і музычнага стылю**

Колькасць гадзін – 2.

Форма контролю ведаў па семестрам – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Студэнт павінен падрыхтаваць аналіз кампазіцыі і жанрава-стылёвых асаблівасцей твораў; вызначыць мастацка-вобразны план, выявіць сэнсавыя і кульмінацыйныя акцэнты паэтычнага тэксту і мелодыі, віды фактуры.

У народнай песне (аўтэнтычнай), а таксама ў апрацоўцы народнай песні азнаёміцца з рэгіёнам яе бытавання і стылістычнымі асаблівасцямі выканання. Для аўтарская песні для народнага хору ці фальклорнага ансамбля неабходна вызначыць форму ізлажэння, меладычныя асаблівасці і складанасці для выканання.

**Заданне 3. Падрыхтаваць аналіз нотнага тэкста**

Колькасць гадзін – 2.

Форма контроля ведаў па семестрам – контрольный урок.

Студэнты павінны падрыхтаваць аналіз вакальна-харавога твору па наступнаму плану:

– ключы, знакі альтэрацыі, танальнасць;

– памер, рытмічныя асаблівасці ізлажэння харавых партый;

– фактура ізлажэння музычнага матэрыялу;

– малюнак вакальнай мелодыі;

– нюансіроўка, тэмпы, дыханне, змена памера і іншыя аўтарскія ўказанні ў запісу нотнага тэкста;

– форма песні і асаблівасці ізлажэння харавога матэрыялу ў адпаведнасці з формай;

-харавы твор з суправаджэннем і без суправаджэння (a cappella).

-сведкі аб аўтарах песні. месца бытавання і запісе.

Наглядна прадэманстраваць на прыкладзе музычнага матэрыялу.

**Заданне 4. Работа над вывучэннем мелодыі песні**

Колькасць гадзін – 2.

Форма контроля ведаў па семестрам – іспыт.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– сальфеджыраванне з такціраваннем;

– асэнсаванне метрычнай структуры, асэнсаванне рытмічнага малюнка;

– выяўленне розных рытмічных і вакальных цяжкасцей;

– работа над фразіроўкай, растаноўка дыхання;

-разбор падтэкстоўкі.

**Заданне 5.** М**астацкае афармленне твора**

Колькасць гадзін –4

Форма кантроля па семестрах-іспыт

Студэнт павінен правесці самастойную работу па стварэнню музычна-мастацкага вобраза, знайсці рашэнні па інтэрпрэтацыі народнай песні. Распрацаваць план пастаноўкі народнай песні, харавой кампазіцыі ці абрадавага дзейства з рухамі, знайсці харэаграфічнае рашэнне.

На іспыту студэнт прапануе рэжысерскае вырашэнне твора, дэманструе канчатковае выкананне падрыхтаваных вакальна-харавых твораў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.2 Рэпертуарныя праграмныя патрабаванні па засваенню тэм вучебнай дысцыпліны

На працягу вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Выканальніцкае майстэрства» студэнт павінен пры выкананні вакальна-харавых твораў паказаць ступень авалодвання выканальніцкім майстэрствам.

На заліке прапануецца прадэманстраваць 2 творы без суправаджэння і 3 творы з суправаджэннем.

### Прыкладныя праграмы для заліку

***Варыянт 1***

Бел. нар. песня ў апр. Л. Ражковой. Беларуская народная песня «Ой, на горке каліна»

Бел. нар. песня ў апр. М. Сіраты “Пайду на рэчку”

Бел. нар. песня у апр М.Сіраты “Добрай вам жа, маладзёначкі”

Бел. нар. песня ў апр. А.Казака “Калі каліна не цвіла”

Бел. нар. песня ў апр. М. Сіраты “ За ліхімі за марозамі”

***Варыянт 2***

Бел. нар. песня Апр. М. Сіраты. Беларуская народная песня «А, мой мілы рабацёшанька”

Бел. нар. песня ў апр. У. Васючкова “Як вывіду луку”

Бел. нар. песня ў апр. В. Калацэя “Як на рэчачцы на дошчачцы”

Бел. нар. песня муз. М. Алешка « Былі ў мяне сваты”

Бел. нар. песня ў апр. І. Грамовіч “Ляцеў воран”

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.3 Сродкі дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

Формамі дыягностыкі засваення вучэбнай дысцыпліны з’яўляюцца:

-кантрольны урок;

-залік;

-выступленне на канцэрце;

-удзел у фестывалі;

-удзел у вакальным конкурсе.

Асноўнымі сродкамі дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці па дысцыпліне “Выканальніцкае майстэрства” з'яўляюцца:

-залічана ці незалічана

-адзнака.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 5. ДАДАТКОВЫ РАЗДЗЕЛ

Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Першы прарэктар
________________
__ __________2019г.
Рэгістрацыйны № УД___уч.

Выканальніцкае майстэрства
Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне па спецыяльнасці
1-16 01 10 Спевы (па напрамках),
напрамку спецыяльнасці
1-16 01 10- 02 Спевы ( народныя)

Мінск 2019



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вучэбная праграма складзена ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарта Рэспублікі Беларусь АСВА 1-16 01 10 2013 Спевы (па напрамках), вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па накірунках спецыяльнасці. Рэгістрацыйны № з

Складальнік
І.М. Грамовіч, кандыдат педагагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры неародна-песеннай творчасці ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў".

Рэцэнзенты:
А.І. Смагін, прафесар кафедры культуралогіі прыватнай установы адукацыі Інстытут сучасных ведаў імя А.М.Шырокава", доктар мастацтвазнаўства, прафесар
Н.І. Дожына, загадчык кафедры тэорыі музыкі і музычнай адукацыі установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

Рэкамендавана да зацвярджэння:
кафедрай беларускай народна-песеннай творчасці ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў (пратакол №9 ад 23.04.2019);
прэзідыўмам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў (пратакол №9 ад 12.06.2019)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна “Выканальніцкае майстэрства” займае важнае месца па падрыхтоўцы выканаўцаў народнай песні. Гэта адна з галоўных прафіліруючых дысцыплін, засваенне якой дапамагае падрыхтаваць высокаадукаванагага спецыяліста.

Практычная работа ў класе па “Выканальніцкаму майстэрству” накіравана на набыццё ведаў па вакальна-харавым, харэаграфічным, музычным і акцерскім майстэрстве. Вучэбны працэс пабудаваны ў цесным узаемадзеянні з іншымі спецыяльнымі дысцыплінамі, якія ўдасканальваюць прафесійныя навыкі студэнтаў. Сярод іх “Гуртавыя спевы”, “Сольныя спевы”, “Харавы клас”, “Сцэнічны рух”, “Асновы дырыжыравання”, “Акцерскае майстэрства” і інш.

Мэта дысцыпліны “Выканальніцкае майстэрства”-даць будучаму спецыялісту неабходныя веды ў вобласці тэхнікі народна-песеннага выканальніцтва, асаблівасцей фальклорных традыцый, майстэрства сцэнічнай інтэрпрэтацыі народнай песні, акцёрскага і педагагічнага майстэрства.

Засваенне вучэбнай дысцыпліны “Выканальніцкае майстэрства” павінна забяспечыць фарміраванне акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных кампетэнцый.

Патрабаванні да акадэмічных кампетэнцый:

АК-4 Уменне працаваць самастойна;

АК-9 Свабодна ўжываць прафесійную тэрміналогію;

АК-19. Валодаць метадалагічнымі ведамі і ўменнямі даследчыка,якія забяспечваюць вырашэнне задач інавацыйна-метадычнай і навуковай дзейнасці.

Патрабаванні да сацыяльна-асобасных камімпетэнцый:

САК-2 Мець высокую духоўнасць;

САК-6 Быць здольным да крытыцы і самакрытыцы;

САК-7 Уменне працаваць у камандзе;

САК-11 Актыўны ўдзел у творчых мерапрыемствах.

Патрабаванні да прафесійных кампетэнцый:

ПК-1 Прафесійна спяваць, артыстычна рухацца;

ПК-2 Ствараць мастацкую інтэрпрэтацыю музычнага твора, валодаць ведамі методыкі работы над вакальным сачыненнем, падрыхтоўкі да публічнага выступлення;

ПК-3 Праводзіць рэпетыцыйную работу з паплечнікамі па ансамблю і ў творчых калектывах;

ПК-9 Выкладаць спецыяльныя дысцыпліны для розных узроставых катэгорый, якія вучацца на ўзроўні, адпавядаюцым патрабаванням сучаснпага вакальнага мастацтва, пастаянна вывучая перадавы педагагічны і выканальніцкі вопыт і творча яго выкарыстоўваючы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ПК-14 Засвойваць разнастайны па эпохам. Стылям, жанрам, мастацкім кірункам педагагічны рэпертуар;

ПК-16 Сістэматычна працаваць над ростам педагагічнага майстэрства, Карыстацца інфармацыйнімі рэсурсамі для азнаямлення з нарматыўнай базай адукацыі і іннавацыямі ў дынаміцы навучання.

ПК-22 Распрацоўваць і рэалізоўваць асабістыя і (ці) сумесныя з музыкантамі-выканаўцамі іншых адукацыйных арганізацый і ўстаноў культуры асветніцкія праекты, у тым ліку, і з выкарыстаннем магчымасцей радыё, тэлебачання, інтэрнэта.

ПК-24 Арганізоўваць работу вучэбнага ці творчага калектыва на адміністратыўных пасадах ва ўстановах адукацыі, культуры і мастацтва

ПК-27 Арганізоўваць работу па падрыхтоўцы навуковых артыкулаў, паведамленняў, рэфератаў і заявак на фінансаванне навуковых, адукацыйных і інавацыйных праектаў і асабіста ўдзельнічаць у іх.

Асноўныя задачы дысцыпліны:

-удасканальванне навыкаў і прыемаў народна-песеннага выканання;

-авалоданне навыкамі харавых спеваў;

-выхаванне пластычнай культуры руху цела і натуральнага каардынацыі з голасам;

-асваенне асноўных прыемаў малюнка танца ў спалучэнні з тэкстам песні.

Выпускнік павінен ведаць:

-традыцыйную вакальна-харавую, танцавальную і музычную культуру Беларусі;

-сувязь народнай манеры спеваў з асаблівасцямі дыялекту, музычнай мовы і вопыту народных спевакоў;

-рэгіянальнымі дыялектнымі адметнасцямі.

умець:

-прафесійна валодаць майстэрствам ансамблевых і харавых спеваў;

-карыстацца каардынацыяй голасу і рухаў;

-свабодна трымацца на сцэнічнай пляцоўцы;

-працаваць над вакальна-харэаграфічнымі кампазіцыямі па матывах каляндарнага і пазаабрадавага цыклаў;

-ажыццяўляць рэжысуру канцэртнага нумару.

валодаць:

-метадамі і прыёмамі кіравання рэпетыцыйным працэсам у фальклорных пеўчых калектывах;

-тэарэтычнымі і выканальніцкімі метадамі аналіза рэпертуара;

-слыхавым кантролем для кіравання працэсам выканання;

-сродкамі выканальніцкай выразнасці для правільнай інтэрпрэтацыі выконваемых твораў.

У кожным семестры развучваецца пэўная колькасць твораў. Увесь час навучання ідзе праца над выканальніцкім майстэрствам, засваеннем прыемаў народна-песеннага майстэрствам, разкрыццем выразных сродкаў у спеваў, разнастайнасцю пеўчых стыляў і формаў (з суправаджэннем і без

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

суправаджэнняя). У рэпертуар уключаюцца творы як у арыгінале, і ў апрацоўках, аўтарскія творы кампазітараў, напісаных для народнага голасу.

Праграма дысцыпліны рэалізуецца на практычных занятках, а таксама у працэсе самастойнай работы. Асновай набыцця ўменняў і навыкаў з'яўляецца падрыхтоўка і ўдзел студэнтаў у канцэртных праграмах.

Выканальніцкая дзейнасць можа ажыццяўляцца ў форме тэматычных канцэртаў, творчых справаздач, удзелу ў агульнаўніверсітэцкіх мерапрыемствах. Выкарыстоўваюцца формы публічнай атэстацыі, адкрытыя урокі, конкурсы, тэматычныя выступленні з канцэртнымі нумарамі. Канцэртная практыка спрыяе развіццю навыкаў калектыўнай творчасці, сцэнічнага peraўвасаблення, удасканаленню выканальніцкміх навыкаў, азнаямленню з методыкай арганізацыі канцэртнага выступлення.

У канцы кожнага семестра праводзяцца творчыя справаздачы студэнтаў.

Вынікам засваення вучэбнай дысцыпліны "Выканальніцкае майстэрства" з'яўляецца залік і экзамен.

## ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

### Уводзіны

Мэты і задачы вывучэння дысцыпліны "Выканальніцкае майстэрства". Дысцыпліна "Выканальніцкае майстэрства" сярод іншых агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін, міжпрадметныя сувязі. Вучэбна-метадычнае забеспячэнне.

### Тэма 1. Асаблівасці тэхналогіі народнай манеры спеваў

Народная манера спеваў як комплекс вакальна-выканальніцкіх сродкаў і прыёмаў. Спеўнае дыханне. Дыкцыя, дакладнае і выразнае вымаўленне тэксту. Засваенне правільнага гукаўтварэння. Выпрацоўка адзінай манеры спеваў. Авалодванне навыкамі спеваў у мікставым і галаўным рэгістрах. Згладжванне і спалучэнне рэгістраў. Спецыфічныя формы выразнасці спеваў. Выпрацоўка чыстай і дакладнай інтанацыі. Асаблівасці інтанавання меладычных і гарманічных гукаспалучэнняў.

### Тэма 2. Практычныя навыкі народна-песеннага выканальніцтва

Метады развіцця галасавога апарата. Задачы распеўкі. Формы і спосабы работы над дыялектам, словам, тэмбрам, фактурай, асаблівасцямі рытма-акцэнтнай арганізацыі песеннага тэкста. Песенная ўстаноўка. Харавы строй, ансамбль. Дакладная перадача мелодыі, рытму, гукавысотнасці, фразіроўкі. Навыкі ансамблевага і харавога выканання. Дакладнае інтанаванне пэўных меладычных і гарманічных спалучэнняў. Падрыхтоўчая работа і авалодванне навыкамі для запісаў песеннага матэрыялу ў гуказапісываючай студыі. Работа з акампанементам. Прынцыпы практычнага вывучэння народных пеўчых традыцый. Узроўні майстэрства: выканаўцы народных песень-пераемнікі фальклорных традыцый-носьбіты традыцый.

### Тэма 3. Стварэнне мастацкага вобраза

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ужыванне выразных сродкаў пры выкананні народнай песні. Работа над нюансамі і дынамічнымі адценнямі: piana, pianissimo, forte, sp і інш. Філіроўка гуку. Работа над тэмпамі у песне. Простыя і складаныя памеры. Работа над штрыхамі: legata, non letgata, staccato, marcata. Акцёрскае майстэрства. Асноўныя прынцыпы стварэння мастацкага вобраза. Стварэнне сцэнічных вобразаў. Каардынацыя спеваў з адначасовым выкананнем жэстаў, рухаў, падтанцовак, элементаў харэаграфіі.

Тэма 4. Спецыфіка работы над музыкальна-харэаграфічнымі і інструментальнымі жанрамі фальклора

Беларускі народны танец і яго выкарыстанне у народнай песне. Элементы сучаснай харэаграфіі ў народнай песне. Сцэнічная інтэрпытацыя народнай песні. Метады засваення форм харэаграфічных рухаў (полька, карагод) прынцыпы развіцця пластыкі, суадносіны рытму, руху і характара шага, выкарыстанне атрыбутыкі: касцюмаў, бутафорыі і інш. Узаемасувязь харэаграфіі з інструментальнай музыкай і песеннымі формамі. Асаблівасці сагласавання іх зместу і сродкаў выразнасці. Спецыфіка выканання народных песень з элементамі руху. Засваенне асноў сцэнічнага руху. Асноўныя элементы беларускага народнага танца. Традыцыйная народная харэаграфія у пастаноўцы песні. Запісы танцавальнага фальклору і яго выкарыстанне у сцэнічнай інтэрпрытацыі народнай песні. Работа над вакальна-харэаграфічнымі кампазіцыямі па матывах народных каляндарана-абрадавых и пазаабрадавых песень.

Тэма 5. Авалоданне майстэрствам імправізацыі

Роля імправізацыі ў народна-песенным выканальніцтве. Імправізацыя ў песеннай творчасці. Імправізацыя, як адзін са шляхоў развіцця творчых здольнасцей. Аваподванне навыкамі распеваў на некалькі галасоў. Прыёмы развіццё музыкальнага слыху. Фарміраванне слыхавога ўспрыяцця. Вакалізацыя песеннага матэрыялу. Спевы "з падводкай". Спевы "з пералівамі". Народная паліфанія. Асаблівасці фактуры харавых партытур розных рэгіёнаў. Навыкі ансамблевых спеваў: двухгалоссе, трохгалоссе, чатырохгалоссе і больш.

Тэма 6. Засваенне рэгіянальных выканальніцкіх народна-песенных традыцый

Асаблівасці рэгіянальных пеўчых традыцый. Аўтэнтычная манера спеваў. Сувязь народнай манеры спеваў з асаблівасцямі дыялекту, музычнай мовы і выканальніцкага вопыту пакаленняў народных спевакоў адной мясцовасці. Засваенне аўтэнтычнай, адкрытай манеры спеваў. Набыццё навыкаў і уменняў выканання вакальных упрыхожванняў: глісандзіраванне, спады голасу, скідванне, пад'езды гуку, слізганне, зацягванне апошняга гука, вымаўленне апошняга гука гаваркам і інш. Выкарыстанне календарна-абрадавага і пазаабрадавага фальклору.

Тэма 7. Асаблівасці рэгіянальных гаворак Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дыялектныя характарыстыкі выканальніцкага стылю. Этапы засваення моўнай сістэмы ў яе дыялектнай своеасаблівасці. Дыялектныя асаблівасці гаворак розных рэгіёнаў Беларусі. Засваенне дыялектных асаблівасцей гаворак. Выкананне народных песень з ужываннем рэгіянальнай гаворкі. Выкарыстанне спецыфічных вымаўленчых прыёмаў пры развучванні паэтычнага тэксту народных песень.

### Тэма 8. Формы і метады выкарыстання песенных матэрыялаў у практыке фальклорнага ансамбля

Розныя формы выкарыстання фальклорных матэрыялаў: апрацоўкі, узнаўленне-рэканструкцыя, засваенне ў стылізаванай і аўтэнтычнай форме. Апрацоўкі народных песень. Аўтарскія творы для народнага голасу. Творы з суправаджэннем. Засваенне навыкаў і ўменняў спеваў народных песень без суправаджэння. Літаратурнае вымаўленне тэксту песні. Паўпрыкрытая народная манера спеваў. Спевы з рознымі відамі суправаджэння: аркестравага, пад фанаграму( -1).

### Тэма 9. Арганізацыя самастойнай работы

Заданні для самастойнай работы. Тлумачэнне значнасці самастойнай работы і методыка яе арганізацыі. Распрацоўка сцэнарнага плана і этапы правядзення рэпетыцыі. Падбор рэпертуару. Пошук мастацкай інтэрпрэтацыі музычных твораў. Работа над выканальніцкім майстэрствам і мастацкім вобразам. Самастойнае выкарыстанне выяўленчых сродкаў для перадачы мастацкага вобраза народнай песні. Работа над якасцю гукаўтварэння. Работа з творамі з музычным суправаджэннем. Пастаноўка нумароў з танцавальнымі рухамі. Падрыхтока матэрыялаў для іх засваення вучэбным фальклорным ансамбле: аналіз і абмеркаванне, выбар і замацаванне. Самастойная расшыфроўка і апрацоўка аўтэнтычных узораў народнай песні. Адзнака дзейнасці розных творчых калектываў. Прагляд и знаёмства з аўдыё- і відыё-матэрыяламі фальклорных фестываляў, канцэртаў, конкурсаў, запісаў матэрыялаў экспедыцый, мйстар-класаў. Перайманне вопыту вядучых спецыялістаў у вобласці народна-песеннага выканальніцтва.

### Тэма 10. Сцэнічнае вырашэнне і інтэрпрэтацыя народнай песні

Выкарыстанне і работа з фальклорным і аўтарскім музыкальна-песенным матэрыялам. Работа з харавымі аўтарскімі творамі. Рэжысура канцэртнага нумару і стварэнне канцэртнай праграмы: ідэйная накіраванасць, развіццё агульнай драматургічнай лініі, завязка, кульмінацыя і фінал, лагічнае выкарыстанне харэаграфіі і персанажаў народных абрадаў. Пабудова танцавальнага малюнку ва ўзаемасувязі з тэкстам народнай песні. Выкарыстанне жэстаў, рухаў у пастановачнай рабоце народнай песні. Пастаноўка вакальна-харэаграфічнай кампазіцыі. Асаблівасці работы з народным абрадавым дзеяннем. Сцэнічная пастаноўка канцэртнага нумару. Замацаванне навыкаў народна-песеннага выканальніцтва з улікам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фальклорных традыцый Беларусі. Замацаванне навыкаў выканання беларускіх абрадаў і вакальна-харэаграфічных кампазіцый. Прынцыпы рэпетыцыйнай работы. Асновы рэпетыцыйнай работы: назапрашванне слыхавога вопыту, авалоданне выканальніцкім стылем, засваенне слоўнікава складу песеннай мовы.

Тэма 11. Арганізацыйныя формы выканальніцкай дзейнасці

Формы і задачы выканальніцкай дзейнасці фальклорнага калектыву (асветніцкія, маральна-выхаваўчыя, мастацка-эстэтычныя, сацыякультурныя). Прынцыпы арганізацыі і сцэнічнае рашэнне канцэрта, фестываля, творчага паказу. Распрацоўка канцэртнай праграмы.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| № | Назва тэмы | Колькасць гадзін | | Форма кантроля ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | | аўдыторныя | КСР | |
| | Уводзіны | 1 | | |
| 1. | Асаблівасці тэхналогіі народнай манеры спеваў | 108 | 112 | экзамен |
| 2. | Практычныя навыкі народна-песеннага выканальніцтва | 74 | 48 | залік |
| 3. | Стварэнне мастацкага вобраза | 26 | 10 | |
| 4. | Спецыфіка работы над музыкальна-харэаграфічнымі і інструментальнымі жанрамі фальклора | 22 | 10 | |
| 5. | Авалоданне майстэрствам імправізацыі | 26 | 10 | |
| 6. | Засваенне рэгіянальных выканальніцкіх народна-песенных традыцый | 15 | 10 | |
| 7. | Асаблівасці рэгіянальных гаворак Беларусі | 18 | 10 | |
| 8. | Формы і метады выкарыстання песенных матэрыялаў у практыке фальклорнага ансамбля | 18 | 20 | залік |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 9. | Арганізацыя самастойнай работы | 18 | 20 | |
| 10. | Сцэнічнае вырашэнне і інтэрпрэтацыя народнай песні | 20 | 44 | |
| 11. | Арганізацыйныя формы выканальніцкай дзейнасці | 6 | 10 | экзамен |
| | Усяго: 656 | 352 | 304 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Літаратура

#### Асноўная

1. Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Гомельская вобласць / укл. В.А. Захарава, Р.М. Кавалёва, В.Д. Ліцвінка. – Мн . : Універсітэцкае, 1989.—384 с.
2. Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Мінская вобласць / укл. В.Д. Ліцвінка, Г.Д. Кутырова. – Мн .: Універсітэцкае, 1995.—250 с.
3. Варфаламеева, Т. Б. Песні беларускага Панямоння / Т.Б.Варфаламеева.— Мн.: Бел.навука, 1980.— 220с.
4. Варфоломеева Т.Б. Северобелорусская свадьба / Т.Б.Варфаламеева. — Мн.:Наука и техника, 1988.—154с.
5. Веснавыя песні / рэд. К.П. Кабашнікаў.— Мн .: Навука і тэхніка, 1979.— 608 с.
6. Вянок беларускіх народных песень / запіс У. Раговіча.— Мн.: Навука і тэхніка,1988.—432с.
7. Вяселле: Абрад / укл. К.А. Цвірка.— Мн.: Бел. навука,—2004.— 683с.
8. Гульні, забавы, ігрышчы / укл. А.Ю. Лозка.—Мн.:Бел.навука, 2003.—534с.
9. Дмитриев, Л.Б. Основы вокальной методики / Л.Б. Дмитриев.---М .: Музыка, 2000.—367 с.

#### Вучэбна-метадычная

10. Елатов, В.И. Песни восточно-славянской общности / В.И. Елатов. — Мн.: Наука и техника, 1977.—245 с.
11. Жартоўныя песні / рэд. А.С. Фядосік.— Мн.:Навука і тэхніка, 1974.—340с.
12. Жніўныя песні / рэд. А.С. Фядосік.— Мн.: Навука і тэхніка, 1974.—348с.
13. Калугина, Н.В. Методика работы с русским народным хором: учеб. для муз. вузов / Н.В. Калугина. — М.: Музыка, 1977. – 256 с..
14. Мажэйка, З.Я. Песні Беларускага Паазер’я / З. Я. Мажэйка. —Мн.: Навука і тэхніка, 1981.— 493с.
15. Малышева, Н.М. О пении / Н.М. Малышева. —М.: Сов. композитор,1988.—135с.
16. Мешко, Н.К. Искусство народного пения. Практическое рук-во и методика обучения искусству народного пения / Н.К.Мешко.— М.: ЛУЧ.—Ч . 2.—2000 .—80 с.17.

17.Руднева, А.В. Русский народный хор и работа с ним / А.В. Руднева. – М.: Сов. Россия, 1974. -- 49 с.

Дадатковая

18. Савельева, В.П. Проблемы вокального обучения руководителей народных хоров / В. П. Савельева // Вопросы хорового образования: Сб. тр. / М-во культуры РСФСР, Гос. Муз.-пед. ин-т. – М., 1985. – Вып. 77. -- 120 с .
19. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т.1. Магілёўскае Падняпроўе / Т.Б. Варфаламеева, В.І. Басько, М.А. Козенка і інш.—Мн.: Бел. навука, 2001.—797с.
20. Шамина, Л.В. Работа с самодеятельным хоровым коллективом / Л. В. Шамина.—М.: Музыка,1983.—176 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.2 Асноўная літаратура


1. Беларускі абрад і сучаснасць. Рэпертуарны зборнік абрадавых песень/ Укл. Дробыш С.І.-Мн.: 1989.-134с.:нот.

2.Грамовіч, І.М., Снапкова, Л.В. Методыка работы з фальклоным гуртам. курс лекцый/ І.М. Грамовіч, Л.В. Снапкова.—Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009.-139с.

3.Дзе мы хадзілі, дзе гулялі. Беларускія народныя песні ў апрацоўцы М. Сіраты /Укл.Шыфрына А.П.- Бел.ін-т праблем культуры.- Мн.:123с.:нот.

3. Дарога ля жыта: Песні бел. кампазітараў на вершы В.Жуковіча/Уклад. В.А. Жукаўовіч.-Мн.:Беларусь,2001.-144с.

4. Дмитриев, Л.Б. Основы вокальной методики / Л.Б. Дмитриев. – М.: Музыка, 2000. – 367 с.

5. Емельянов, В.В. Фонопедический метод формирования певческого голосообразования / В.В. Емельянов.--Новосибирск: Наука. Сибирское отд.,1991.-39с.

6. Калугина, Н.В. Методика работы с русским народным хором: Учеб. для муз. вузов / Н. В. Калугина.—М.: Музыка, 1977. – 255с.

7. Малышева, Н.М. О пении: из опыта работы с певцами / Н.М. Малышева. — М.: Советский композитор, 1988.—135с.

8. Мешко, Н.К. Искусство народного пения. Практическое рук-во и методика обучения искусству народного пения /Н.К.Мешко.-- Ч. 2., М.: НОУ « ЛУЧ», 2000.- 80 с.

9.Руднева, А.В. Русский народны хор и работа с ним / А.В. Руднева. – М.: Сов. Россия, 1974.- 49с.

10.Савельева, В.П. Проблемы вокального обучения руководителей народных хоров // Вопросы хорового образования: Сб. тр. М-во культуры РСФСР/ В.П.Савельева.-- Гос. муз.-пед. ин-т. – М., 1985. – Вып. 77. С. 120-125.

11.Самарин, В.А. Хороведение: Учеб. пособие для студ. сред. муз.-пед. учеб. заведений / В.А. Самарин.- М.: Издательский центр «Академия», 1998.-208с.

12.Шамина, Л.В. Работа с самодеятельным хоровым коллективом / Л.В. Шамина.—М.: Музыка, 1983.-175с.

13.Барсов, Ю.А. Вокально-исполнительские и педагогические принципы М.И. Глинки / Ю.А. Барсов.- Л.: Музыка, 1968.-66с.

14.Витт, В.В. Практические советы обучающимся пению / В.В. Витт.- П.: Музыка, 1968.-68с.

15. Вопросы вокальной педагогики. Сборник статей. Вып.1., Гос. муз. из-во.-1962.-147с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

16.Крывіцкі, А.А. Сучасная беларуская літаратурная мова і народныя гаворкі /Т-ва па распаўсюджанні паліт. і навук. ведаў БССР /А.А. Крывіцкі.—Мн..1961.—40с.
17.Медведева, М. Методика хоровой аранжировки для руководителей фольклорных песенных коллективов /М. Медведева.-М.: ВНМЦ и КПР, 1982.-87с.
18.Менабени, А.Г. Методика обучения сольному пению: Учебное пособие для пед. ин-тов /А.Г. Менабени.-М.: Просвещение, 1987.-93с.
19.Огороднов, Д.Е. Воспитание певца в самодеятельном ансамбле / Д.Е. Огороднов.- Киев: Муз. Украина, 1989.-66с.
20.Сушко І.Ф. Ты спявай, маё сэрца, спявай…Рэпертуарны зборнік для вакальна-харавых калектываў/І.Ф. Сушко.-Мн.: Выдавецтва Уладзімір Сіўчыкаў.-2017.-108с.:дыск.
21.Сысоў,У.М. З крыніц спрадвечных/У.М.Сысоў.-Мн.:Выш.шк., 1997.-415с.
22.Холупава. Л.І. Пастаноўка голасу і вакальны ансамбль: вучэб.дапам./ Л.І. Холупава, І.М. Грамовіч, Л.Л. Ражкова.—Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008.-189с.
23.Чурко, Ю. М. Белорусский хореографический фольклор/Ю.М. Чурко.-Мн.:Выш.шк.:1990.-415с.:ил.

### 5.3 Дадатковая літаратура

1.Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Мінская вобласць / Укл. В.Д. Ліцвінка, Г.Д. Кутырова.-Мн.: Універсітэцкае, 1995.-250с.
2.Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Гомельская вобласць / Укл. В.А. Захарава, Р.М. Кавалёва, В.Д. Ліцвінка, --Мн.: Універсітэцкае, 1989.-384с.
3.Варфаламеева, Т. Б. Песні беларускага Панямоння / Т.Б. Варфаламеева.—Мн.: Бел.навука, 1980.—220с.
4. Варфоломеева Т.Б. Северобелорусская свадьба / Т.Б.Варфаламеева. — Мн.:Наука и техника, 1988.—154с.
5. Веснавыя песні / рэд. К.П. Кабашнікаў.— Мн .: Навука і тэхніка, 1979.— 608
6.Вянок беларускіх народных песень / Запіс У. Раговіча.—Мн.: Навука і тэхніка,1988.-432с.
7. Вяселле: Абрад / укл. К.А. Цвірка.— Мн.: Бел. навука,—2004.— 683с.
8. Гульні, забавы, ігрышчы / укл. А.Ю. Лозка.—Мн.:Бел.навука, 2003.—534с.
9. Демина, Л.В. Народное музыкальное творчество:свадебный обряд славян Тюменской области:учебное пособие для студентов музыкальных вузов/Л.В.Демина.-Тюмень :РИЦ Т ГАКИ, 2009.-240.:нот
10. Жартоўныя песні / рэд. А.С. Фядосік.— Мн.:Навука і тэхніка, 1974.—340с.
11. Жніўныя песні / рэд. А.С. Фядосік.— Мн.: Навука і тэхніка, 1974.—348с.
12.Елатов, В.И. Песни восточно-славянской общности / В. И. Елатов.—Мн.: Наука и техника.-1977.-245с.
13.Мажэйка, З.Я. Песні Беларускага Паазер'я / З.Я. Мажэйка.-Мн.:Навука і тэхніка.1981. 493с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

14.Мажэйка, З.Я., Варфаламеева, Т.Б. Песнi Беларускага Падняпроўя / З.Я. Мажэйка, Т.Б.Варфаламеева. —Мн.: Бел навука,1999.—276с.
15.Мишуров Г.С. Белорусские народные инструменты . Педагогические аспекты Инструментальногоисполнительства/МишуровГ.С;М-во культуры Респ. Беларусь, Белорус. Гос ун-т культуры и искусств.-Минск:БГУКИ.2016.-364с.
16.Можейко, З.Я. Песни Белорусского Полесья / З. Я. Можейкою-М.:Сов.композитор,1983.--Вып.1.—184с.
17.Раговiч, У.I. Песенны фальклор Палесся. Песнi святочнага календара / У.I. Раговiч.—Мн.: Чатыры чвэрцi, 2001.—Т.1.—526с.
18.Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. Магiлёўскае Падняпроўе / Укл. Варфаламеева Т. Б.—Мн.: Беларуская навука, 2001.—Т.1.—796с.
19. Малышева, Н.М. О пении / Н.М. Малышева. —М.: Сов. композитор,1988.135с.
20. Савельева, В.П. Проблемы вокального обучения руководителей народных хоров / В. П. Савельева // Вопросы хорового образования: Сб. тр. / М-во культуры РСФСР, Гос. Муз.-пед. ин-т. – М., 1985. – Вып. 77. -- 120 с .
21. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т.1. Магiлёўскае Падняпроўе / Т.Б. Варфаламеева, В.I. Басько, М.А. Козенка i iнш.—Мн.: Бел. навука, 2001.—797с.
22. Шамина, Л.В. Работа с самодеятельным хоровым коллективом / Л. В. Шамина.—М.: Музыка,1983.—176 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ